Хоцімская раённая бібліятэчная сетка
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі



# Чытаем па-беларуску: проза XX - XXI стагоддзяў

Віртуальная выстава


XX
стагоддзе

**Арлоў, У. А. Сны імператара** : апавяданні, аповесці, эсэ / Уладзімір Аляксеевіч Арлоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. — 383 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0500-8.
ББК 84(4Беи)6
А 82




Гісторыя Беларусі — асноўная тэма творчасці Уладзіміра Арлова. Кнігу склалі творы, якія ўваскрашаюць падзеі беларускага мінулага з часоў нашай першай дзяржавы – Полацкага княства — да XX стагоддзя.

Чытача чакаюць сустрэчы з паэтам Міколам Гусоўскім, філосафам Казімірам Лышчынскім, паўстанцамі 1863 года, царазабойцамі Ігнатам Грынявіцкім і іншымі вядомымі і невядомымі асобамі айчынай гісторыі.

**Брыль, Я. Птушкі і гнёзды** : выбранае / Янка Брыль. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — 463 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0813-9.
ББК 84(4Беи)-44
Б 80

Раман “Птушкі і гнёзды” і аповесць “Золак, убачаны здалёк” даволі даўно вядомыя нашаму чытачу, перакладзеныя на некалькі еўрапейскіх моў, а таксама і навейшая па часе напісання трагічна-ўзнёслая аповесць “Муштук і папка” ўтвараюць своеасаблівы таленавіты трыпціх, тройчы па-рознаму арыгінальна, яскрава гаворачы пра адно, найгалоўнейшае ў жыцці людзей і народаў, - свабоду, мір, чалавечнасць.



Чытаем па-беларуску: проза XX – XXI стагоддзяў

**Зарэцкі, М. Кветка пажоўклая** : апавяданні, аповесць / Міхась Зарэцкі ; укладальнік Н. Семашкевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 431 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0568-7.
ББК 84(4Беи)-44
З-35




Вядомы беларускі пісьменнік Міхась Зарэцкі (1901–1937) — зачынальнік рамантычнага кірунку ў беларускай літаратуры 20-х гадоў, пісьменнік-наватар, аўтар апавяданняў і раманаў “Сцежкі-дарожкі” і “Вязьмо”.

Апавяданні М. Зарэцкага — адна з найбольш цікавых і змястоўных старонак беларускага прыгожага пісьменства.

**Жук, А. А. Над чыстым полем** : аповесці, апавяданні / Аляксандр Аляксандравіч Жук. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. — 479 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0495-8.
ББК 84(4Беи)6-4
Ж 85




У кнігу вядомага беларускага пісьменніка Алеся Жука ўвайшлі аповесці “Чыгун”, “Халодная птушка”, “Паляванне на Апошняга Жураўля”, “Праклятая любоў” і апавяданні розных гадоў.

Гэтыя творы ў свой час адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа, Літаратурнай прэміяй імя І. Мележа і прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

**Карпюк, А. Н. Пушчанская адысея** : аповесць, апавяданні / Аляксей Нічыпаравіч Карпюк ; укладальнік Ю. Пацюпы. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009.  527 с.  — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1096-8.
ББК 84(4Беи)-44
К 26

Стыль шчырага і бескампраміснага рэалізму Аляксея Карпюка (1920–1992) балансуе на мяжы дакументалістыкі і мемуарыстыкі. Суровая, асабіста перажытая праўда пра вайну стала асновай аповесці “Пушчанская адысея”. Апавяданні пісьменніка, як кадры, выхапленыя фотааб’ектывам, адкрываюць дынаміку даваеннага і паваеннага беларускага жыцця з яго каханнем, трагізмам і досціпам.



**Марчук, Г. В. Кветкі правінцыі** : раман, навелы, афарызмы / Георгій Васільевіч Марчук. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 416 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0593-8.
ББК 84(4Беи)-44
М 30

Кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Руспублікі Беларусь (1996), вядомага пісьменніка Георгія Марчука склалі раман “Кветкі правінцыі”, навелы і афарызмы.

У рамане аўтар даследуе прычыны самагубства маладой жанчыны, расследаванне якіх вядзе яе сын. Умела выкарыстоўваючы дэтэктыўныя матывы, яркія мастацкія дэталі, Г. Марчук дакладна стварае партрэт правінцыйнага гарадка. У навелах аўтар зацікаўлена ўглядаецца ў побыт вёскі і горада, прасочвае лёсы людзей на стыку стагоддзяў. Творам Г.Марчука ўласцівы псіхалагізм, філасафічнасць, дынамізм дзеяння.



**Лынькоў, М.** **Над Бугам** : апавяданні, аповесці, урыўкі з рамана / Міхась Лынькоў ; укладальнік З. Пазняк. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 446 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0535-0.
ББК 84(4Беи)6-4
Д 88




У кнігу народнага пісьменніка Міхася Лынькова (1899–1975) увайшлі лепшыя апавяданні, аповесці “Апошні зверыядавец”, “Міколка-паравоз”, урыўкі з рамана “На чырвоных лядах”. Свет створаных М. Лыньковым вобразаў стракаты і шматаблічны. Пісьменнік абраў шлях глыбокага пранікнення мастака ў псіхалогію чалавека, у сферу пачуццяў і думак.

**Мележ, І. П. Людзі на балоце** : раман з “Палескай хронікі” / Іван Паўлавіч Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 366 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0549-0.
ББК 84(4Беи)-44
М 47




“Людзі на балоце” — выдатны раман народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа (1921–1976), першы з цыкла “Палеская хроніка”.

**Мележ, І. П. Подых навальніцы** : раман з “Палескай хронікі” / Іван Паўлавіч Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 479 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0589-X.
ББК 84(4Беи)-44
М 47

“Подых навальніцы” — другі раман з цыкла “Палеская хроніка” народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа (1921–1976).



Чытаем па-беларуску: проза XX – XXI стагоддзяў

**Пархута, Я. С. Сонечныя борцi** : аповесць, лiрычныя навелы / Яраслаў Сiльвестравiч Пархута ; укладальнiк Ю. Пацюпа. — Мiнск : Мастацкая лiтаратура, 2011. — 463 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1271-9.
ББК 84(4Беи)-44
П 18

У асобе Яраслава Пархуты (1930–1996) шчаслiва злучылiся якасцi, якiя лiчацца несумяшчальнымi: з аднага боку — краязнаўца, публiцыст, прывязаны да фактаў, да канкрэтыкi, а з другога боку — вытанчаны паэт-iмпрэсiянiст, падрабязны летапiсец прыроды, майстар пейзажу. I ўсё гэта арганiчна сплятаецца ў адным творы, у адной кнiзе, нават у адным сказе. Кнiга “Сонечныя борцi” знаёмiць з найлепшымi мастацкiмi творамi пiсьменнiка: дакументальнай аповесцю пра “палескага рабiнзона”, чалавека складанага лёсу, якi пражыў у пушчы сорак гадоў, i непаўторнымi лiрычнымi, фiласофскiмi навеламi.



**Пташнікаў, І. М. Тартак** : аповесць і апавяданні / Іван Мікалаевіч Пташнікаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. — 462 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0496-6.
ББК 84(4Беи)6-4
П 87

Тэма вайны, балючай народнай памяці пра яе ахвяр займае ў творчасці вядучага беларускага празаіка Івана Пташнікава асаблівае месца.

“Тартак” — аповесць пра трагічны лёс беларускай вёскі, разам з людзьмі спаленай фашыстамі ў час блакады.

У кнігу ўвайшлі апавяданні, у якіх расказваецца пра падлеткаў, якія заспелі вайну і цяжкія пасляваенныя гады, пра складаныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі і не менш складаную нашу рэчаіснасць.



**Рубанаў, У. Я. Укус змяі** : раманы / Уладзіслаў Якаўлевіч Рубанаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 337 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0891-0.
ББК 84(4Беи)-44
Р 82




Раман “Укус змяі” прысвечаны тэме адвечнай барацьбы бездухоўнай часткі грамадства з адухоўленай, здольнай ствараць. На думку аўтара, усе рэвалюцыі, войны, канфлікты, уключаючы і сямейныя, і ёсць не што іншае, як выяўлене гэтай барацьбы.

Невялічкі раман “Паветраная жанчына” сам аўтар назваў авантурным. Эмацыянальна афарбаваны, вострасюжэтны твор прысвечаны неператожнаму каханню.

**Стральцоў, М. Ад маладзіка да поўні** : апавяданні, аповесці, эсэ / Міхась Стральцоў ; укладальнік В. Стральцовай. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. — 430 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0761-2.
ББК 84(4Беи)-44
С 83

У кнігу прозы вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1988) Міхася Стральцова (1937–1987) увайшлі лепшыя апавяданні розных гадоў, аповесці “Адзін лапаць, адзін чунь”, “Загадка Багдановіча”, эсэ.



**Сачанка, Б. І. Апошнія і першыя** : аповесці, раман у навелах, апавяданні / Барыс Іванавіч Сачанка ; укладальнік Т. Сачанка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 447 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0701-9.
ББК 84(4Беи)-44
С 22




У кнігу вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, Літаратурнай прэміі імя І. Мележа Барыса Сачанкі (1936–1995) увайшлі аповесці “Апошнія і першыя”, “Родны кут”, выбранае з рамана ў навелах “Чужое неба” і апавяданні розных гадоў.

**Чыгрынаў, І. Г. Плач перапёлкі** : раман, апавяданні / Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў ; укладальнік Л. Чыгрынавай. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 415 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0674-8.
ББК 84(4Беи)-44
Ч-98




Кнігу народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава (1934–1996) склалі раман “Плач перапёлкі” і апавяданні розных гадоў.

**Чорны, К. Вераснёвыя ночы** : апавяданні, раман / Кузьма Чорны ; укладальнік Т. Грамадчанкі, А. Гурскай. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 429 с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0621-7.
ББК 84(4Беи)-44
Ч-75




Кнігу класіка беларускай літаратуры, майстра прозы Кузьмы Чорнага (1900–1944) склалі выбраныя апавяданні розных гадоў і раман “Млечны Шлях”.


XXI
стагоддзе

**Гніламёдаў, У. В. Уліс з Прускі** : раман / Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — 382 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 985-02-0863-5.
ББК 84(4Беи)-44
Г 56

Раман беларускага пісьменніка У. Гніламёдава прысвечаны падзеям пачатку XX стагоддзя, які супаў з дзяцінствам і юнацтвам галоўнага героя тора Лявона Кужаля. Юнаком — як новы Уліс — ён ідзе ў Амерыку, знаёміцца з нязвыклым для сябе светам і новай філасофіяй жыцця, што, аднак, не пазбаўляе яго ад розных нечаканасцей, горкіх хвілін, страт і расчараванняў.

Аўтар змог стварыць цікавыя, запамінальныя вобразы і характары, дакладна перадаць каларыт тагачаснага жыцця, побыт, звычкі, павер'і, гістарычныя падзеі і паданні.



**Гаўрыловіч, У. М. Плата за каханне** : раман, аповесць, апавяданні / Уладзімір Мікалаевіч Гаўрыловіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 254 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0911-5.
ББК 84(4Беи)-44
Г 24

Падзеі рамана “Забранае шчасце” адбываюцца на жыткавіцкім Палессі, каля балотнага Князь-возера, у 30-я гады XX стагоддзя – час карэнных грамадскіх перамен. З гэтага часу была свая неаспрэчная праўда, якая вяла да трагічнай, непазбежнай пагібелі адных, хто быў не згодны з ломкай жыцця ці не паспеў да яе прыстасавацца, і да немінучай, не менш страшнай, маральнай пагібелі другіх, хто інакшага выбару, як падпарадкавацца, не бачыў.

Згубленыя шчасце, каханне, надзея… Што стане галоўнай апорай у жыцці, такім складаным і супярэчлівым? Пошукі адказу на гэтае пытанне – у займальных, арыгінальных, напісаных з пазіцыі сучаснасці творах пісьменніка Уладзіміра Гаўрыловіча.




Чытаем па-беларуску:
проза
XX – XXI
стагоддзяў

**Гніламёдаў, У. В. Вяртанне** : раман / Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 429 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1078-4.
ББК 84(4Беи)-44
Г 56

У гэтым рамане расказваецца пра вяртанне на радзіму ў 1922 годзе бежанцаў з Заходняй Беларусі, якія апынуліся ў Расіі яшчэ ў час Першай сусветнай вайны. Пасля сямі гадоў выгнання галоўнага героя твора Лявона Кужаля і яго аднавяскоўцаў чакалі не толькі зарослыя хмязняком родныя котлішчы, беднасць і нястача, але і іншыя: дзяржава — адноўленая Польшча. Тут, у ваколіцах Белавежскай пушчы, бурлілі высокія хвалі палітычных страсцей, бо надта шмат было незадаволеных існуючым рэжымам. Аўтар здолеў стварыць цікавыя, запамінальныя вобразы і характары, дакладна перадаць каларыт эпохі 20-х гадоў XX стагоддзя…



**Казлоў, А. С. Юргон** : раманы, аповесці, апавяданні / Анатоль Сяргеевіч Казлоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — 255 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 985-02-0854-6.
ББК 84(4Беи)-44
К 14




У новую кнігу Анатоля Казлова ўвайшлі раманы, аповесці і апавяданні. Як і ў ранейшых творах, пісьменнік па драбніцах аналізуе ў сваёй прозе сучаснасць, у розных ракурсах разглядае партрэт "героя нашага часу”. Мэтанакіравана вывучае прычынна-выніковыя сувязі, якія фарміруюць асобу, уплываюць на яе светапогляд, кіруюць дзеяннямі.

Усім творам пісьменніка характэрна міфалагізацыя і містыфікацыя ў спалучэнні з сённяшнім жыццём. Падзеі раманаў бяруць пачатак у старажытнасці, а іх далейшае развіццё адбываецца ў сучаснасці.

Проза Анатоля Казлова вызначаецца высокай эмацыянальнай і мастацкай напоўненасцю.

**Федарэнка, А. М. Ланцуг** : аповесці / Андрэй Міхайлавіч Федарэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — 240 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1361-7.
ББК 84(4Беи)-44
Ф 32

Новую кнігу прозы Андрэя Федарэнкі складаюць шэсць аповесцей, напісаных у розныя гады.

Як і заўсёды, проза А. Федарэнкі чытаецца лёгка. Але гэта зусім не лёгкае чытво. Аўтар імкнецца спасцігнуць духоўны свет сучасніка, зразумець яго клопаты і трывогі. Творы пісьменніка вызначаюцца любоўю да чалавека, добрым веданнем жыцця, тонкім псіхалагізмам, шчырасцю.



**Федарэнка, А. М. Нічые** : аповесці, раман / Андрэй Міхайлавіч Федарэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. — 430 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1071-5.
ББК 84(4Беи)-44
Ф 32

Аповесці “Нічые”, “Вёска” і раман “Рэвізія”, што складаюць чарговую кнігу лаўрэата Літаратурнай прэміі імя І. Мележа Андрэя Федарэнкі, яшчэ пад час часопісных публікацый атрымалі шырокі чытацкі розгалас, прычым ацэнкі былі неадназначныя, нават палярныя. Чытаюцца гэтыя творы лёгка, яны насычаны дэтэктыўна-прыгодніцкімі элементамі, разам з тым аўтар прытрымліваецца строгай дакладнасці гістарычных фактаў.



**Наварыч, А. Літоўскі воўк** : гістарычны раман / Алесь Наварыч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. — 285 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).

ISBN 985-02-0758-2.
ББК 84(4Беи)-44
Н 15

Вострасюжэтны твор, прасякнуты духам авантурызму і ўзбагачаны любоўнай раманнай інтрыгай, запрашае чытача ў час паўстання 1863–1864 гг.

